УДК 338.2(476)+316.42(476)

**Беларускі шлях сацыяльна-арыентаванай эканомікі**

Швайба. Д. М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Аналізуючы сённяшняе эканамічнае становішча можна зразумець, што наша дзяржава знаходзіцца на раздарожжы, і канкурэнтаздольнасць – гэта тое самае паняцце, якое раскрывае ўсю дылему якая стаіць перад эканомікай краіны.

Зыходзячы з вопыту прыняцця мер па росту канкурэнтаздольнасці, даследчыкі прапаноўваюць два асноўных шляху развіцця эканомікі: верхні і ніжні.

З'яўленне такога разумення сыходзіць каранямі да гісторыі XVIII стагоддзя, калі двух васалаў пасадзілі ў турму пасля таго, як іх лорд няўдала паспрабаваў ажыццявіць паўстанне. Першага з васалаў забілі, а другога выпусцілі з турмы. Нidh road значыць «дарога жыцця», а low road – «дарога смерці».

Такім чынам набыццё хутка састарваючых замежных тэхналогій, прыцягненне інвестыцый у сувязі з нізкім коштам працоўнай сілы і продаж прыродных рэсурсаў па заніжанай цане, ўцечка інтэлектуальных рэсурсаў і капіталу ў іншыя краіны – усё гэта характарыстыкі ніжняга шляху. Верхні шлях мае на ўвазе прымяненне перадавых тэхналогій у вытворчасці, рост каштоўнасці прынцыпова палепшанай прадукцыі, прыток інтэлектуальнага і фінансавага капіталу. На жаль, фінансаванне НДВКП у краіне па-ранейшаму не вялікае, у той час як у Злучаных Штатах яно складае 2%, у Японіі 3%. Гэты факт запавольвае развіццё навукаёмістай вытворчасці ў дзяржаве. Заработныя платы навуковых супрацоўнікаў і даследчыкаў па-ранейшаму нізкія, акрамя гэтага ёсць цяжкасці з фінансаваннем і падтрымкай доўгатэрміновых даследчых праектаў

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, неабходна вылучыць патрэбу ў наступных напрамках: захаванне канкурэнтаздольнасці пры аптымальным спалучэнні дзяржаўных і рынкавых спосабаў рэгулявання эканомікі, развіваць навуковы патэнцыял і ўдасканальваць сістэму адукацыі. На гэтым этапе асабліва важна заняць уласную нішу ў сусветнай гаспадарцы, імкнучыся да верхняга шляху развіцця канкурэнтаздольнасці, рэфармуючы адукацыю.